*УДК 372.8.81*

# МАЎЛЕНЧЫ ЭТЫКЕТ ЯК СКЛАДНІК КАМУНІКАТЫЎНАЙ КУЛЬТУРЫ ВУЧНЯЎ: КАМУНІКАТЫЎНА-ПРАГМАТЫЧНЫ І ЛІНГВАМЕТАДЫЧНЫ АСПЕКТЫ

**С. В. Мартынкевіч**

*Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі,*
*пр. Фрунзе, 21, 210009, г. Віцебск, Беларусь, svetlana_mrt@mail.ru*

У артыкуле вызначаюцца шляхі авалодання вучнямі формуламі маўленчага этыкету ў кантэксце фарміравання камунікатыўнай культуры вучняў установ агульнай сярэдняй адукацыі пры навучанні беларускай мове. Разглядаюцца ўмовы і формы практычнай вучэбнай дзейнасці, накіраванай на развіццё маўлення вучняў, засваенне этыкетных адзінак, выхаванне культуры маўленчых зносін.

***Ключавыя словы:*** працэс навучання беларускай мове; формулы маўленчага этыкету; камунікатыўная культура; маўленчыя практыкаванні.

# SPEEH ETIQUETTE AS A COMPONENT OF THE COOMMUNICATIVE CULTURE OF STUDENTS: COMMUNICATIV-PROGMATIC AND LINGU-METODOLOGICAL ASPECT

**S. V. Martynkevich**

*Vitebsk Regional Institute for the Development of Education,*
*Frunze Ave., 21, 210009, Vitebsk, Belarus, svetlana_mrt@mail.ru*

The article defines the ways of students' mastery of speech etiquette formulas in the context of formation of communicative culture of students of general secondary education institutions while learning the Belarusian language. The conditions and forms of practical educational activities aimed at the development of students' speech, learning of etiquette units, education of the culture of speech communication are considered.

***Key words:*** Belarusian language learning process; speech etiquette formulas; communicative culture; speech exercise.

Маўленчы этыкет з’яўляецца складнікам культуры паводзін і маўленчых зносін чалавека. У працэсе сацыялізацыі чалавек авалодвае мовай, засвойвае этычныя нормы ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі. Этыкет звязаны з сістэмай маральных каштоўнасцей і нормаў народа, яго гісторыяй, эмпірычнымі формамі паводзін людзей. Маўленчы этыкет валодае нацыянальнай спецыфікай, бо мова адлюстроўвае канцэптуальную

карціну свету ў моўных адзінках, да якіх адносяцца і формулы маўленчага этыкету.

Культурныя нормы чалавек засвойвае на працягу жыцця, пры гэтым асноўныя ўменні фарміруюцца ў перыяд школьнага навучання: уменні агульнай культуры, культура мовы і маўлення, культура вучэбнай дзейнасці. Для паспяховага суразмоўніцтва важныя такія якасці асобы, як назіральнасць, памяць, мысленне, здольнасці аналізаваць учынкі чалавека, інтуіцыя, уяўленне, выхаванасць, «станоўчая настроенасць на іншых людзей, здольнасці да суперажывання, спачування, якія выступаюць як агульны фон, на якім адбываецца суразмоўніцтва з людзьмі» [1, с. 104]. Гэта значыць, што ў працэсе навучання павінны засвойвацца і пэўныя маральныя каштоўнасці і ідэалы, якія вызначаюць паводзіны людзей у час маўлення. Культура маўлення і мыслення непасрэдна звязаны з маўленчай дзейнасцю – стварэннем выказвання, праз якое адбываецца ўздзеянне на пачуцці і думкі суразмоўцы.

На думку сацыялінгвістаў, «... чалавек валодае пэўнай сукупнасцю сацыялізаваных, прынятых у дадзеным сацыяльным калектыве нормаў суразмоўніцтва, якія ўключаюць як уласна моўныя нормы, так і правілы сацыяльнага ўзаемадзеяння» [2, с. 159]. Таму арганічным складнікам навучання беларускай мове будзе спецыяльна створаная сістэма працы, падпарадкаваная задачам фарміравання сацыякультурнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый. Авалоданне адзінкамі маўленчага этыкету, у якіх адлюстроўваюцца асаблівасці самой сістэмы беларускай мовы, нацыянальнага характару, мыслення і культуры народа з'яўляецца асновай фарміравання лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі. Нормы камунікатыўнай культуры, правілы маўленчых паводзін, веданне і ўменні мэтазгоднага выкарыстання формул маўленчага этыкету з'яўляюцца арганічнай часткай сацыякультурнай кампетэнцыі.

Асабліва важнай бачыцца праблема вызначэння правіл і нормаў камунікатыўнай культуры ў сувязі з актыўным пашырэннем суразмоўніцтва ў сетках інтэрнэта – камунікатыўнага асяроддзя, у якім беларуская мова не стрымліваецца строгімі нарматыўнымі рэгламентацыямі, што ў сваю чаргу не замінае яе натуральнаму развіццю. Выразы маўленчага кантакту, ветлівыя звароты – гэта своеасаблівая візітоўка карыстальніка сеціва пры ўваходзе ў чат ці на форум. Аналіз некаторых тэкстаў інтэрнэт-маўлення паказаў выкарыстанне як традыцыйных зваротаў і формул маўленчага этыкету (*Спадарства! / Шаноўнае спадарства! / Вітаю спадарства!; Шаноўная грамада!; Паважаныя пані і паненкі!* і інш.), так і арыгінальных этыкем, што з'яўляюцца ў пэўнай ступені маўленчымі наватворамі (*Шанавенства!; Грамацеі-пісьменцы!; Мае любыя шкаляры!, Шаноўныя бульбазаўры!*). Адной з асноўных асаблівасцей інтэрнэт-

вітанняў з'яўляецца выкарыстанне скарочаных слоў, усячэнне фіналяў. Напрыклад, часта выкарыстоўваюцца такія этыкемы, як «*Віт!*», «*Прывіт!*». Сустракаюцца словы-вітанні, запазычаныя з іншых моў. Напрыклад, этыкема «*Хай*» – з англійскай мовы, дзе *hi* – выклічнік, які перакладаецца «*прывітанне*»).

У неафіцыйных месенджах паміж суразмоўцамі пашыраны вітанні *«Чалом!»*, *«Салют!»*. У пэўны гістарычны прамежак развіцця грамадства слова «*салют*» актыўна выкарыстоўвалася ў наступных значэннях: 1) урачыстая форма прывітання або аддача пашаны каму-, чаму-небудзь ружэйнымі або артылерыйскімі залпамі, падняццем ці апусканнем сцяга і пад.; 2) піянерскае прывітанне, якое выражаецца ў падняцці над галавой правай рукі [3, с. 61]. У сучаснай моўнай практыцы выклічнік «*Салют!*» актыўна выкарыстоўваецца для прывітання і прыцягнення ўвагі ў неафіцыйнай сітуацыі.

Гутарковы стыль сучаснай беларускай мовы не вызначае строгіх літаратурных нормаў, таму часта ўзнікаюць эмацыйна афарбаваныя этыкетныя словы і выразы. У неафіцыйнай сферы камунікацыі паступова замацоўваюцца новыя адзінкі маўленчага этыкету: *«Вітанкі!»*, *«Вітаначкі!»*, *«Бусечкі!»*. Этыкема *«Бусечкі!»* суправаджае жэст, прымальны ў асяроддзі блізкіх людзей, – паветраны пацалунак, дзеянне, якое ў неафіцыйных сітуацыях выражае ўвагу, прыхільнасць, сімпатыю.

Такім чынам, формулы маўленчага этыкету сучаснай беларускай мовы з'яўляюцца разнастайнымі з пункту гледжанння этымалогіі і стылістыкі, структуры і ўтварэння. Беларускі маўленчы этыкет утрымлівае як уласна беларускія этыкетныя формулы, якія даўно функцыянуюць у мове, так і новыя ветлівыя выразы, што ўказвае на дынамічнасць маўленчаых працэсаў.

Развіццё ў вучняў звязнага маўлення – адна з галоўных задач сучаснай моўнай адукацыі. Маўленчая дзейнасць не можа наладжвацца без усведамлення сітуацыі і мэтанакіраванасці маўлення, мэтай якога можа стаць паведамленне факта ці выяўленне яго прычыны, інфармаванне ці пабуджэнне да дзеяння.

Вучэбная праграма па беларускай мове прадугледжвае авалоданне правіламі маўленчага этыкету на ўсіх этапах навучання, што ўключае:

- узбагачэнне маўлення вучняў формуламі і выразамі маўленчага этыкету рознай камунікатыўнай накіраванасці;
- знаёмства вучняў са спосабамі разгортвання формул маўленчага этыкету ў адпаведнасці з камунікатыўнай сітуацыяй;
- развіццё інтанацыйных уменняў.

Задачы маўленчых практыкаванняў «этыкетнага» характару наступныя:

• пазнаёміць вучняў з паняццем *маўленчы этыкет* і яго функцыямі, тыповымі маўленчымі сітуацыямі і адпаведнымі маўленчымі формуламі;

• фарміраваць усведамленне нацыянальных адрозненняў маўленчага этыкету, у якім адлюстраваны багаты вопыт, непаўторнасць ладу жыцця і звычаяў беларускага народа;

• фарміраваць культуру маўлення ў адпаведнасці са сферамі суразмоўніцтва, актуальнымі для вучняў, – сацыяльна-бытавой, сацыяльна-культурнай, вучэбнай;

• выпрацоўваць уменні ўжываць этыкетныя маўленчыя формулы ў наступных сітуацыях: прывітанне, развітанне, просьба, падзяка, прабачэнне, устанаўленне кантакта, прыцягненне ўвагі, знаёмства, камплімент, размова па тэлефоне і інш.;

• фарміраваць уменні дарэчнага выражэння ўласнага эмацыйнага стану (радасці, спачування, віны і інш.) згодна з асаблівасцямі камунікатыўнай сітуацыі;

• фарміраваць культуру вуснага і пісьмовага маўлення вучняў;

• выхоўваць асобасныя якасці, такія як добазычлівасць, тактоўнасць, папераджальнасць, стрыманасць, прыязнасць у адносінах да суразмоўцы ў розных маўленчых сітуацыях;

• выхоўваць моўны эстэтычны густ.

Этыкет і правілы паводзін, як і мова, засвойваецца як шляхам пераймання, так і ў практычнай вучэбнай дзейнасці пры выкананні такіх заданняў, як:

• аналіз тэкстаў выразнай маральна-этычнай накіраванасці;

• складанне этыкетных слоўнікаў для пэўных сітуацый маўлення;

• стварэнне камунікатыўных каментарыяў да этыкетных сітуацый і іх абгрунтаванне;

• складанне дыялогаў па прапанаваных сітуацыях;

• аналіз і параўнанне камунікатыўнай мэты розных сітуацый зносін, адбор этыкетных формул і выразаў для пэўнай сітуацыі;

• передача сродкамі этыкету пачуццяў (захаплення, радасці, іроніі) у вусных і пісьмовых выказваннях;

• інсцэніраванне сітуацыйных выказванняў з адпрацоўкай інтанацыі;

• назіранне за невербальнымі сродкамі (жэстамі, мімікай, размяшчэннем суразмоўцаў) і абгрунтаванне іх мэтазгоднасці ці немэтазгоднасці ў пэўных стуацыях;

• стварэнне ўласных выказванняў на аснове тэматыкі і зместу прапанаваных тэкстаў, прыказак, прымавак, фразеалагізмаў «этыкетнага» характару.

Міжпрадметныя сувязі з беларускай літаратурай, гісторыяй, этнаграфіяй і іншымі вучэбнымі прадметамі дазваляюць выкарыстоўваць цікавыя і арыгінальныя дыдактычныя тэксты ў працэсе навучання мове. Фальклор як мастацтва слова і скарбніца духоўнага багацця народа адыгрывае вялікую ролю ў эстэтычным выхаванні вучняў, бо ў творах вуснай народнай творчасці перададзены не толькі народная мудрасць, але і традыцыі маўленчага этыкету, шырока прадстаўлены шматлікія маўленчыя сітуацыі і формулы этыкету. Гэта стварае магчымасць засяроджваць увагу вучняў на тэкстах, якія раскрываюць тэму любові да Радзімы, гасціннасці і добразычлівасці беларусаў, аналізаваць правілы паводзін, асноўнае з якіх – паважлівыя адносіны людзей ў час стасункаў.

Такім чынам, маўленчая культура з’яўляецца галоўным складнікам агульнай культуры чалавека, адным з важнейшых паказчыкаў цывілізаванасці грамадства. Складаная сацыяльная сістэма ўсталёўвае такія правілы і межы паводзін індывідаў, у якіх гэтыя паводзіны становяцца прымальнымі і стабільнымі. Менавіта такімі межамі і з’яўляецца этыкет як сістэма правілаў знешняй культуры чалавека, яго паводзін. Таму ў сістэме навучання неабходна ў першую чаргу распрацоўваць такія кірункі, якія спрыялі б засваенню як ведаў агульнай культуры паводзін, так правіл камунікатыўна культуры. Мэтай моўнай адукацыі з’яўляецца фарміраванне як лінгвістычнай, маўленчай, так і камунікатыўнай і сацыякультурнай кампетэнцый вучняў. У сувязі з гэтым вывучэнне маўленчага этыкету ўключаецца ў розныя віды вучэбнай дзейнасці, што стварае мачымасць весці працу сістэмна і беаперапынна. Разам з гэтым вучні знаёмяцца з культурай сваёй краіны, узбагачаюць слоўнікавы запас, вучацца камунікатыўна мэтазгоднаму маўленню.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Бодалёв А. А.* Психология о личности. М. : Изд-во Моск. ун-та, 1988.

2. *Беликов В. И., Крысин Л. П.* Социолингвистика. М. : Рос. гос. гуманит. ун-т, 2001.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. Т. 5, кн. 1: С–У / рэд. т. М. Р. Суднік / пад агульн. рэд. К. К. Атраховіча (К. Крапівы); АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. Мінск : БелСЭ, 1982.